**Рачыцкая, В.** Салдат / В. Рачыцкая // Міёрскія навіны. – 2010. – 13 лют. – С. 3.

## САЛДАТ

Я жыву ў самым маленькім горадзе Беларусі – Дзісне. Ён вельмі ціхі і спакойны. Мне падабаецца хадзіць па яго вуліцах, дзе ўсё дыхае гісторыяй, напамінае пра мінулае. Але больш усяго я люблю праводзіць час са сваім татам. Летам мы з ім ходзім у лес, збіраем ягады і грыбы, часта бываем на рыбалцы. А зіма – цудоўная пара, каб пакатацца на лыжах і каньках. Вы б пабачылі, як у таты гэта выдатна атрымліваецца! Проста зайздрасць бярэ. А доўгімі зімовымі вечарамі, седзячы ля тэлевізара, я люблю проста пагаварыць з татам аб усім на свеце: пра школу, сяброў і сяброваак, нашы захапленні, будучае і мінулае. Іншы раз гартаем сямейныя фотаальбомы.

Аднойчы, калі майго старэйшага брата Дзіму выклікалі ў ваенкамат, тата прынёс свой салдацкі альбом і неяк па-асабліваму сказаў: «Вось, сын, хутка і твая чарга прыйдзе быць салдатам. Гэта святы абавязак кожна-га мужчыны... Толькі б не было вайны... А сам я павраяваў.» Я здзівілася: «Тата, а калі ж ты ваяваў, бо ў нас даўно не было вайны?»

Ён адкрыў альбом і паказаў нам здымак. На ім – малады салдат, але нейкі вельмі сур'ёзны, не па-юнацку засяроджаны.

– Гэта ў Афгане... 22 кастрычніка 1986 года я таксама атрымаў павестку з ваенкамата: Пётр Вячаслававіч Рачыцкі прызываўся ў рады Савецкай Арміі. Трапіў у Чырванасцяжную Сярэднеазіяцкую пагранічную акругу – горад Тэрмез ва Узбекістане. Тут на працягу трох месяцаў праходзіў вучэбную падрыхтоўку, а потым быў накіраваны ў Афганістан. Прыбылі туды на верталётах, потым нас размеркавалі па ўзводах. Я трапіў у мінамётную батарэю. Практычна ўсе аб'екты ваеннай базы знаходзіліся пад зямлёй, асабовы састаў жыў у зямлянках. Вядома, з першых дзён з'явіліся новыя знаёмыя, сябры.

Наша база знаходзілася ля горада Мазары-Шарыф. Прырода там своеасаблівая: клімат вельмі спякотны, тэмпература днём да 55-60 градусаў, расліннасці практычна няма, дрэвы растуць толькі ў населеных пунктах ля арыкаў. А навокал базы – горы. Прыгожа і сурова глядзяцца высокія скалы. У глыбокіх шчылінах невялічкія рачулкі, але ж такія гаманлівыя. У пачатку вясны на вяршалінах гор ляжыць снег, а ўнізе – гарачае каменне. Вось дзе дакладна лета з зімою сустракаецца – у тарах.

– Тата, але ж там, сярод гэтай прыгажосці ішла вайна! 3 кім вы ваявалі?

– Нашу базу вельмі часта абстрэльвалі душманы рэактыўнымі снарадамі з гор. На любое свята яны імкнуліся напомніць пра сябе. Кожную ноч мы заступалі на пасты, каб ахоўваць базу і горад. Часта здзяйснялі баявыя рэйды па блакіраванню і знішчэнню бандфарміраванняў. Даводзілася перакрываць караванныя сцяжынкі, каб душманы не маглі пастаўляць зброю і боепрыпасы з Пакістана.

Тата прыпыніўся, углядваючыся ў здымкі. Было бачна, што яго трывожылі нялёгкія ўспаміны. Я таксама прыціхла, чакала, калі ён загаворыць сам... І вось у цішыні зноў загучаў голас салдата той вайны:

– Гэта было ў ліпені 1988 года. Наша мотаманеўраная група атрымала заданне рушыць баявой капонай праз пустыню да кішлака Джангаль-Арык. Па дадзеных разведкі там знаходзілася банда душманаў. Калона рухалася двое сутак. Тры мотаманеўраныя групы і пяць дэсантна-

штурмавых узялі кішлак у шчыльнае кальцо. Але наша мінамётная батарэя трапіла пад абстрэл безаткатных гармат з паселішча. Тады па загаду капітана Вішнякова наш 120 мм мінамёт адкрыў агонь у адказ.

Душманы прыціхлі, і рэштак дня прайшоў спакойна ў падрыхтоўцы баявых пазіцый. А ў 20.00 яны пайшлі на прарыў. Пачаўся цяжкі бой. Ён доўжыўся ўсю ноч. Душманы так і не змаглі прарваць нашу абарону, але і ў нас не абыйшлося без страт: два байцы былі цяжка паранены, а чатыры загінулі... Чатыры маці засталіся без сыноў... Гэтае супрацьстаянне доўжылася месяц і два тыдні. Частка банды была знішчана, астатніх узялі ў палон. Ведаеш, у такіх рэйдах заўсёды дапамагалі згуртаванасць, узаемавыручка, сяброўства. Там, на вайне, усё гэта пачынаеш цаніць неяк па-іншаму, па-сапраўднаму...

Тата зноў маўчыць. Праз бацькоўскае плячо ціхенька гляджу на здымак. На ім чацвёра байцоў, маладых і прыгожых, сярод іх і мой тата, ва ўсіх на грудзях медалі. І тут я пачынаю разумець, што мой тата не проста салдат, а герой, бо ўзнагароды на вайне салдатам проста так не даюць. Я абдымаю яго і прашу расказаць, як усё было.

– На фотаздымку я са сваімі сябрамі, баявымі таварышамі. Сфатаграфаваліся адразу пасля ўзнагароджвання за смеласць і мужнасць у надта цяжкіх баявых рэйдах, – крыху засмуціўшыся працягвае бацька. – Шмат сяброў загінула. На шчасце, мы выжылі. Надыйшоў доўгачаканы час «дзембеля». Усім вельмі хацелася дадому, да сваіх родных і блізкіх. Два баявыя гады чакалі салдаты гэтага дня. Уяві наш стан, калі аб'явілі, што мы застаёмся да поўнага вываду савецкіх войск з Афганістана. Гэта быў моцны ўдар: здавалася, што мы ўжо ніколі не выберамся з таго пекла. Але моцнае салдацкае братэрства дапамагло пратрымацца яшчэ паўгода. Мне здаецца,што яно яшчэ больш умацавалася. І вось, нарэшце, у лютым 1989 года нашы войскі пакінулі Афганістан, усе выжыўшыя ў той страшнай вайне вярнуліся дадому. І я таксама…

Мы не прыкмецілі, як да нас падсела мама. Яе голас прагучаў нечакана:

– Я вельмі добра памятаю той дзень, калі сустрэла вашага тату. Ён быў малодзенькім, прыгожым, худзенькім хлопчыкам. Нават не верылася, што вярнуўся з вайны, выжыў, але не ацалеў: ваш тата быў паранены. Так, мы з ім былі даўно знаёмыя, але доўгі час не бачыліся. А тады ён падыйшоў да мяне і першым загаварыў: мы расказвалі адзін другому пра сваё жыццё весь вечар, потым сталі сустракацца кожны дзень: нам было добра і весела, цікава разам. А праз нейкі час пажаніліся. І цяпер у нас вось такая дружная сям’я.

Гэты вечар быў для мяне сапраўдным адкрыццём. Я прывыкла, што тата заўсёды побач, што ён такі надзейны. Але, што ён яшчэ і воін – гэта для мяне стала нечаканасцю. Слухала яго аповяд і адчувала гордасць за свайго бацьку. Я была шчаслівая, што ён МОЙ тата, што ён застаўся жывы на той вайне. А яшчэ я зразумела, чаму ён сказаў майму брату: «Толькі б не было вайны!»

Я ціхенька абняла сваіх тату і маму. Цяпер я па-сапраўднаму разумею якая я шчаслівая.

**В. Рачыцкая**